Да верніка ад... нядзельнага каталіка

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
05.12.2021 00:00

Каму патрэбна навяртанне? Мы прызвычаіліся лічыць, што гэта гісторыя пра алкаголікаў, распуснікаў, забойцаў… Мы штотыдзень удзельнічаем у св. Імшы, спавядаемся – можа, нават часцей, чым двойчы на год, перад двума галоўнымі святамі – ды думаем, што і сябе, і Бога пазналі да канца. Аднак як гэта магчыма, калі Бог – бясконцы, а духоўны рост не мае межаў. Дык, можа, навяртанне – гэта пра кожнага з нас? †

“Важна быць сярод людзей, якія на адной хвалі з табой”

Анатоль большую частку свайго жыцця быў практыкуючым каталікам: прыняў належныя сакраманты, у кожную нядзелю ўдзельнічаў у св. Імшы, па пятніцах – пост. Нібы ўсё ў парадку, але на жыццё не ўплывае. ***“Аднак Бог знайшоў шчыліну, праз якую змог да мяне дастукацца. Мая жонка паходзіць з набожнай каталіцкай сям’і, і каб заслужыць давер, я пачаў больш адказна ставіцца да рэлігійных практык. Рабіў гэта дзеля яе, а Госпад дзейнічаў праз яе”,***
– распавядае мужчына.

Як адзначае сам Анатоль, аднойчы жонка адправіла яго на рэкалекцыі для мужчын. Ён пайшоў, слухаў і – пачуў. ***“Падчас духоўных практыкаванняў мяне кранулі пэўныя словы. Пад уражаннем, пасля заканчэння я пабег хутчэй у «Баторыю» (*** бліжэйшы да касцёла пункт з абменам валют – заўв. аўт),
каб прадаць долары, што былі з сабой, і купіць усю літаратуру, якую ксёндз прапанаваў набыць напрыканцы рэкалекцый”,

– узгадвае Анатоль.

Пазнанне Бога пачалося для мужчыны даволі празаічна: першая з кніг, што ён набыў у той вечар, мела назву “Як палюбіць цешчу”. Госпад пачаў далікатна ўваходзіць у штодзённасць. Пасля прачытання ўсёй літаратуры, Анатоль зразумеў – яе няма з кім абмеркаваць.

Магчыма, тады вернік спасціг асноўную думку – для духоўнага развіцця каталіку патрэбна супольнасць. Да супольнасці мы пакліканы і праз вучэнне Бібліі.

Менавіта жывыя сведчанні людзей побач і сумесныя разважанні з аднадумцамі ў рамках руху “Мужчыны св. Юзафа” адкрывалі Анатолю асобу Бога і дапамаглі паверыць, што змяніць жыццё ў тых сферах, дзе хочаш яго змяніць, – магчыма. ***“Меў месца і пераломны момант. Я быў дома адзін, адпачываў на ложку пасля выпітага піва, калі мной моцна авалодала думка аб раскаянні. Мне не падабалася ідэя маліцца пасля алкаголю, таму я проста прамовіў: «Божа, мне патрэбна дапамога, каб падняцца (з грахоў)». І маё цела падае на падлогу, а я пачынаю каяцца нават у тых правінах, што раней і не лічыў грахамі. Гэты эпізод можа падацца містычным, але ж падобныя моманты здараюцца на працягу ўсёй гісторыі існавання Касцёла”,*** – адзначае вернік.

Перамены, што адбываліся ў Анатолю, заўважалі і ў яго акружэнні. Мужчына ўвогуле перастаў лаяцца матам, што ў калектыве будаўнікоў было дзівам і часам выклікала ўсмешку. ***“Калі прыбраў мацюкі, злавіў сябе на думцы, што мне не хапае літаратурнага запасу, каб камунікаваць з калегамі. І я пачаў шмат чытаць”,*** – дадае Анатоль.

“Паказальнай у справе даверу Богу з’яўляецца для мяне і сітуцыя з дочкамі, з якімі мне было вельмі цяжка навязаць кантакт. Я штучна цікавіўся, як іх справы, і не сустракаў рэакцыі, – шчыра дзеліцца мужчына. – ***Атрымаў падказку таксама дзякуючы працэсу пазнання Госпада. Слухаючы аднаго з духоўных лідараў, пачуў пра практыку «спатканняў». Цяпер раз у год я па чарзе запрашаю сваіх дачок на рандэву: кожная сама выбірае месца, меню, а пасля – кветкі. З адной ідзём у піцэрыю, з другой – у «Бургер Кінг», пасля адна просіць палявыя кветкі, другая – ружы. Я слухаю, адказваю на іх упадабанні і атрымліваю шчырыя расповеды пра іх надзённасць. Цяпер штораз пасля працы мяне сустракаюць цёплыя абдымкі”.***

Як прызнаецца мужчына, да навяртання ён успрымаў Бога як паліцэйскага, які не чапае цябе, пакуль ты выконваеш правілы, а калі што – адразу карае. Цяпер Госпад для яго – гэта любячы Айцец, які працягвае руку чалавечай слабасці і дапамагае выправіцца. ***“З кожным годам вобраз Бога ў маіх вачах становіцца шырэйшы. Калі думаю, што адчыняю апошнія дзверы, аказваецца, што за імі яшчэ тры дзвярных праёмы…”,*** – падсумоўвае Анатоль.

Аўтар: Ангеліна Марцішэўская
05.12.2021 00:00

[redacted]**. Стань**